ПРОЛЕТАРЫІ УСЯХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 263 (335) | Аўторак 19 лістапада 1940 г. | Цана 10 кап.

У кожным калгасе — два вадаёма

241

Па ініцыятыве калгаснікаў калгаса „Железнодорожник", Талаўскага раёна ў Варонежскай абласці шырока разгарнулася будаўніцтва мясцовых вадаёмаў. Пачын талаўцаў падхоплен калгаснікамі ўсёй краіны.

З чэрвеня па лістапад у абласці пабудавана 1168 шахтных калодзежаў, 539 прудоў. 1412 прудоў і 5474 калодзежаў адрамантавана. Усяго ў абласці цяпер налічваецца 8894 вадаёма — па 2 вадаёма амаль у кожным калгасе. У Талаўскім раёне пабудавана і капітальна адрамантавана 72 пруда і 228 шахтных калодзежаў. Сельскагаспадарчая арцель „Железнодорожник" мае 6 прудоў.

У 108 калгасах створаны фермы водаплаваючай птушкі. У новыя пруды выпушчана некалькі дзесяткаў мільёнаў малькоў зеркальнага карпа.

(ТАСС).

ПРЫЦЯГНУЦЬ БЕСПАРТЫЙНЫ АКТЫЎ ДА АГІТАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ

Наша большэвіцкая партыя і яе правадыры Ленін і Сталін заўсёды надавалі выключна важнае значэнне палітычнай агітацыі, як аднаму з важнейшых сродкаў комуністычнага выхавання мас.

На ўсіх этапах соцыялістычнага будаўніцтва палітычная агітацыя была і застаецца тым сродкам, пры дапамозе якога партыя згуртоўвае, пераконвае і арганізоўвае працоўныя масы на барацьбу за народную справу, на барацьбу за пабудову комуністычнага грамадства.

Толькі добра пастаўленая агітацыйна-масавая работа робіць лозунгі нашай партыі даходчывымі і зразумелымі для шырокіх мас працоўных. Толькі шляхам добра пастаўленай растлумачальнай работы можна дасягнуць узорнага выканання палітычна-гаспадарчых задач, стаячых перад працоўнымі нашай соцыялістычнай радзімы.

Большэвіцкая партыя вырасціла з нетраў рабочага класа, сялянства і інтэлігенцыі велізарную армію выдатных агітатараў, якія штодзённа растлумачваюць працоўным рашэнні партыі і ўрада, адказваюць на шматлікія пытанні, дапамагаюць разабрацца працоўным у важнейшых падзеях міжнароднай і знешняй палітыкі. Многія агітатары робяць здабыткам усіх працоўных лепшы вопыт работы стахановаў, рашуча крытыкуюць і падштурхоўваюць адстаючых у рабоце, ведуць барацьбу з недахопамі і косностю, разгільдяямі, лодырамі, дэзарганізатарамі вытворчасці, часта выступаюць ініцыятарамі і арганізатарамі датэрміновага выканання вытворчых планаў, дзяржаўных абавязацельстваў, зніжэння сабекошту прадукцыі, павышэння прадукцыйнасці працы і праводзяць рад другіх мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне магутнасці нашай соцыялістычнай дзяржавы.

Аб лепшых узорах агітацыйна-масавай работы ярка сведчаць вынікі прайшоўшых выбараў у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР у заходніх абласцях Беларусі. Сталінскі блок комуністаў і беспартыйных у выбарах перамог таму, што для агітацыйнай работы партарганізацыі прыцягнулі шырокія масы саміх працоўных, беспартыйны актыў.

У перыяд адбыўшыхся выбараў у Вярхоўныя органы Совецкай улады да палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця нашай абласці далучыліся дзесяткі тысяч людзей, якія ў былой панскай Польшчы былі бяспраўнымі. Зараз гэтыя людзі з поспехам працуюць у дзяржаўных органах, кіруюць прадпрыемствамі, культурнымі ўстановамі, самі арганізуюць радаснае шчаслівае жыццё пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Так, напрыклад, былы бядняк Пронька Дзяменцій Грыгоравіч, прымаўшы актыўны ўдзел у разгроме афіцэрскіх банд у верасні мінулага года, зараз працуе старшынёй Волчынскага сельсовета, Высокаўскага раёна. Не гледзячы на сваю перагружанасць, ён заўсёды знаходзіць час пагутарыць з сялянамі аб міжнародным становішчы, пачытаць газету, расказаць насельніцтву, што робіцца ў гарадах нашай радзімы, аб пульсуючым жыцці грамадзян краіны соцыялізма. Дзяменцій Грыгоравіч карыстаецца сярод сялян добрым аўтарытетам. Ён аказвае значную дапамогу партыйнай арганізацыі ў правядзенні масавай палітычнай агітацыі.

Вялікую агітацыйна-масавую работу праводзіць сярод насельніцтва былы батрак вёскі Шубічы, Пружанскага раёна, актывіст Хмара Андрэй. З першых дзён прыходу Чырвонай арміі тав. Хмара ўключыўся ў актыўную работу па соцыялістычнаму будаўніцтву. Ён арганізаваў у вёсцы сялянскі камітэт, дапамог падзяліць паміж батракамі і беднякамі зямлю памешчыка, прымаў актыўны ўдзел у выбарах у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР.

Як член сельсовета тав. Хмара паказвае прыклад сваім аднавяскоўцам па выкананню дзяржаўных абавязацельстваў. Ён першым паехаў на будаўніцтва Днепра-Бугскага канала, арганізаваў абоз з дровамі для горада, сабраў грошы па падпісцы на пазыку Трэцяй пяцігодкі, выканаў датэрмінова хлебапастаўкі. Па ініцыятыве тав. Хмары ў вёсцы Шубічы пабудаван клуб для сялян. Зараз у сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у мясцовыя Саветы т. Хмара праводзіць з сялянамі гутаркі аб Сталінскай Канстытуцыі і выбарчым законе. Яго агітацыя завостраная, прынцыповая і праўдзівая. Яна дзейнічае на слухачоў праматой і актуальнасцю.

Выдатныя ўзоры дзейснай наступацельнай агітацыі паказваюць актывісты Гайнаўскага лесахімкамбіната тт. Дзеніскі, Маеўскі і Курпета. Сілай уласнага прыкладу, штодзённымі змястоўнымі гутаркамі яны разгортваюць сярод рабочых завода соцыялістычнае спаборніцтва, садзейнічаюць яго далейшаму пашырэнню ва ўсіх цэхах.

За апошні час райкомы партыі Жабінкаўскага, Шэрашэўскага, Пружанскага, Бярозаўскага і другіх раёнаў дабіліся значных дасягненняў у аб'яднанні вакол партыйных арганізацый беспартыйнага актыва. У Гайнаўскім раёне прыцягнута да актыўнай работы ў выбарчай кампаніі звыш 70 чалавек беспартыйнага актыва, у Жабінкаўскім раёне 87 і г. д.

Сістэматычна ўдзельнічаюць у масавай палітычнай рабоце настаўнікі Бярозаўскага раёна т.т. Раскін, Кузнацоў іншыя. Тав. Раскін за апошні час прачытаў насельніцтву 5 дакладаў на тэмы: аб Сталінскай Канстытуцыі, законадаўстве совецкай улады, аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы і інш. Настаўнік вёскі Новае, гэтага-ж раёна, тав. Кузнацоў рэгулярна праводзіць сярод выбаршчыкаў гутаркі аб выбарчым законе.

Вопыт паказаў, што там, дзе партыйныя арганізацыі па-дзелавому дапамагаюць беспартыйнаму актыву, там актывісты праводзяць сярод насельніцтва вялікую агітацыйна-масавую работу, там агітацыя носіць дзейсны наступацельны характар.

Аднак, не ва ўсіх раёнах добра пастаўлена работа з беспартыйным актывам. Да такіх раёнаў адносяцца Сямяцінскі, Косаўскі, Шышкі і другія. Тут як следа не наладжана яшчэ работа з агітатарамі і агітколектывамі. Беспартыйны актыў не прыцягваецца да ўдзелу ў масавай палітычнай агітацыі.

Зараз наступіў адказнейшы этап выбарчай кампаніі — агітацыя за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Партыйныя арганізацыі павінны ўзначаліць палітычную актыўнасць мас, скарыстаць шырока ў агітацыйна-масавай рабоце вялікую армію беспартыйнага актыва, накіраваць яго актыўнасць на лепшае правядзенне выбараў у мясцовыя Саветы депутатаў працоўных.

5 лістапада Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР тав. М. І. Калінін уручыў маршальскі знак адзіччa „Маршальская Звязда" маршалам Совецкага Саюза

Маршал Совецкага Саюза К. Е. Варашылаў — Маршал Совецкага Саюза С. М. Будзённы — Маршал Совецкага Саюза С. К. Тімашэнка — Маршал Совецкага Саюза Г. І. Кулік — Маршал Совецкага Саюза Б. М. Шапашнікаў

Фота Ф. Кіслова. Фота ТАСС.

ДАСТОЙНЫ СЫН СОВЕЦКАГА НАРОДА

Прасторны чыгуначны клуб станцыі Бяроза запоўнен народам. Гэта выбаршчыкі Блудзенскай акругі сабраліся на сустрэчу са сваім кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета.

Першае слова прадстаўляецца калгаснику калгаса „Зара" Скробату Васілю Нікалаевічу.

— Нашы калгаснікі, — гаворыць тав. Скробат, — вылучылі кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета аднавяскоўца Шэляпетка Міхаіла Сцяпанавіча, якога аднадушна падтрымалі ўсе выбаршчыкі акругі. Тав. Шэляпетка сын селяніна. Ён з малых год сустрэўся з нуждой і бядотай, з поўным бяспраўем працоўных пры панаванні польскіх памешчыкаў і капіталістаў і невыпадкова ён быў цесна звязан з рэвалюцыйным рухам за вызваленне працоўных. Будучы комсамольцам-падпольшчыкам, усе ўскладзеныя на яго задачы, выконваў дакладна, як падабае вернаму сыну працоўнага народа. Не адзін чырвоны сцяг вывешаны яго рукой пальмнеў над вёскай Асаўцы, наводзіў жах на нянавісных прыгнятальнікаў.

З часу вызвалення працоўных Заходняй Беларусі Міхаіл Сцяпанавіч з'яўляецца актыўным удзельнікам будаўніцтва новага жыцця. Ён актыўны арганізатар калгаса і комсамольскай арганізацыі, сакратаром якой зараз з'яўляецца. На калгаснай рабоце ён з'яўляецца стаханаўцам. Там дзе не ладзіцца з работай, праўленне калгаса пасылае тав. Шэляпетка і ён сваім прыкладам натхняе маладых калгаснікаў на паспяховае выкананне сельгаспрацаў. Вось чаму нашы калгаснікі пры абмеркаванні кандыдатуры ў дэпутаты абласнога Совета адразу-ж назвалі імя тав. Шэляпетка. Ён будзе дастойным дэпутатам у абласны Совет, дастойным слугой народа.

Дружнымі апладысментамі прысутныя сустрэлі свайго кандыдата тав. Шэляпетка. Простыя і шчырыя ад усяго сэрца словы Міхаіла Сцяпанавіча аб сваім жыцці і дзейнасці былі заслуханы з выключнай увагай. — Я жыў толькі адной думкай, — гаворыць тав. Шэляпетка, — служыць чесна працоўнаму народу. І зараз, калі выбіраюць дэпутатам у абласны Совет дэпутатаў працоўных, буду чесна і аддана служыць сваёй радзіме, совецкаму народу. За вялікую справу партыі Леніна — Сталіна не пашкадую, калі гэта спатрэбіцца, аддаць і сваё жыццё. Нехай жыве наш вызваліцель вялікі Сталін!

Удзельнікі схода паслалі пісьмо правадыру народаў таварышу Сталіну, у якім яны сардэчна дзякуюць большэвіцкай партыі за сваё вызваленне, за шчаслівае жыццё пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі і абяцаюць у дзень выбараў галасаваць за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

А. Рожанец.

НА ВЫБАРЧЫМ УЧАСТКУ

Кампанія па выбарах у мясцовыя Саветы депутатаў працоўных на выбарчым участку № 15 (Красналескі сельсовет, Кобрынскі раён) у поўным разгары. Выбарчы ўчастак, дзе будзе адбывацца галасаванне, размешчан у былым памешчыцкім маёнтку. Для яго адведзен светлы і чысты пакой, які добра абстаўлен. Тут своечасова былі вывешаны спісы выбаршчыкаў.

Самай маладой выбаршчыцай на ўчастку з'яўляецца Екацярына Кандрацьеўна Казловіч, якая нарадзілася 14 снежня 1922 года. Напярэдадні дня галасавання ёй споўніцца роўна 18 год. Самымі старымі выбаршчыкамі з'яўляюцца Агафія Мартынаўна Паўзун, якой споўнілася 82 годы і 75-гадовы Фелікс Якаўлевіч Клімашэўскі. Яны жывуць на адлегласці 10 кілометраў ад выбарчага ўчастка. У дзень галасавання за імі будзе пасланы падвода. Да хворых выбаршчыкаў камісія пашле на дом свайго члена з малай запасной урнай і яны прымуць удзел у галасаванні.

На ўчастку шырока разгарнулася агітацыйна-масавая работа. Агітатары прымацаваны да населеных пунктаў, дзе праводзяць з выбаршчыкамі вывучэнне Палажэння аб выбарах, а таксама агітацыю за вылучаных кандыдатаў у депутаты. Лепшымі агітатарамі з'яўляюцца 17-гадовы комсамолец Міхаіл Кавалевіч і яго сястра комсамолка Таццяна Кавалевіч.

Сяляне вёскі Млынак вылучылі кандыдатам у депутаты раённага Совета селяніна-бедняка Нікалая Нікалаевіча Кавалевіча.

П. Данілаў.

Да ўсіх лесарубаў і возчыкаў Совецкай Беларусі

Пісьмо стаханаўскай брыгады лесарубаў Стаўбцоўскага леспрамгаса

Хутка споўніцца год, як мы працуем на лесазагатоўках у Стаўбцоўскім леспрамгасе. Многа перамен адбылося ў нашым жыцці за прайшоўшы перыяд. Мы пазналі радасць соцыялістычнай працы, праца стала для нас справай чэсці, доблесці і геройства. Мы адчуваем сваё свабодным. У краіне соцыялізма людзей ценяць па іх працы, па іх творчых здольнасцях, накіраваных на ўмацаванне нашай соцыялістычнай радзімы. Мы ведаем, што кожны загатоўлены намі кубаметр драўніны пойдзе на патрэбы соцыялістычнага будаўніцтва, і ўсе пашы імкненні, уся наша энергія накіраваны на гэта, каб лепш і больш прадукцыйна працаваць, каб даць краіне тысячы кубаметраў высокаякаснай драўніны звыш устаноўленага плана.

Добра аўладаўшы стаханаўскімі метадамі работы, працуючы брыгадай, мы сапраўды адчулі вялікую перавагу гэтага метада ў параўнанні з ранейшым, калі мы працавалі ў адзіночку, або на пару. У мінулым годзе ў пачатку вімы у нашым леспрамгасе былі ўсяго тры брыгады лесарубаў, а зараз іх 27. Гэтай колькасць падвоіцца — у гэтым мы ўпэўнены. Толькі ў брыгадзе можна дасягнуць высокай прадукцыйнасці працы. За апошнія 8 месяцаў наша брыгада атрымала адных премій надбавак 6.109 руб., выпрацаваўшы 1.264 нормы. На працягу ўсяго года не было амаль ні адзнаго дня, каб наша брыгада давала менш 230 проц. дзённага задання. У катэгорычнику месячны план выканан на 270 проц., заработак кожнага члена брыгады складае 900 — 1 000 рублёў у месяц.

Дасягнуўшы зімой мінулага года рэкордная выпрацоўкі, мы на гэтым не спынніся. Трэба было замацаваць першыя поспехі і сістэматычна, планамерна, з дня ў дзень павышаць тэмпы. Гэтага мы дабіліся. Але стаханаўцы ніколі не спыняюцца на дасягнутым, яны ўвесь час шукаюць новых шляхоў для паўхільнага руху ўперад. Таму мы імкнемся ўсяляк павышаць сваю прадукцыйнасць.

Магчымасцей для гэтага вельмі многа ў кожным леспрамгасе, у кожнай брыгадзе, трэба толькі працаваць чесна і самаадцана. Мы-ж працуем не на капіталістаў, не на памешчыкаў, а на сябе, для свайго народа, для сваёй соцыялістычнай краіны. Мы працуем над тым, каб наша радзіма стала яшчэ больш багатай, яшчэ больш магутнай.

Нашай краіне патрэбен лес. Яго чакаюць вугальшчыкі Данбаса, гарнякі Крывога Рога, яго чакаюць лесапільныя, дрэваапрацоўчыя, хімічныя, запалкавыя прадпрыемствы, соцыялістычныя будоўлі. Гэты лес мы павінны даць, і мы яго дадзім.

Абмеркаваўшы на вытворчай нарадзе брыгады гэтае пытанне, мы рашылі, што наш план на IV квартал у 3.000 кубаметраў мы можам выканаць датэрмінова да 15 снежня. Мы ўпэўнены, што гэта могуць зрабіць і астатнія брыгады.

Таварышы лесарубы і возчыкі! Арганізуем соцыялістычнае спаборніцтва па прыкладу вугальшчыкаў, металістаў, нафтавікоў нашай краіны за лепшую, высокаякасную работу, за датэрміновае выкананне месячнага і квартальнага плана, за павышэнне прадукцыйнасці працы, за прымяненне дасканалых стаханаўскіх метадаў работы. Давайце працаваць так, як гэтага патрабуе і вучыць нас вялікі правадыр народаў Іосіф Вісарыёнавіч Сталін.

У заходніх абласцях нашай рэспублікі набліжаецца дзень выбараў у мясцовыя Саветы. Гэту вялікую дату мы павінны сустрэць новымі вытворчымі перамогамі. Брыгада абавязваецца к 15 снежня — дню выбараў — загатовіць звыш плана 2.000 кубаметраў высокаякаснай драўніны і заклікае да гэтага ўсіх лесарубаў і возчыкаў.

Таварышы лесарубы і возчыкі рэспублікі! Вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва, шырэй стаханаўскі рух! Дадзім нашай краіне лесаматэрыялы ў дастатковай колькасці.

ВЛАДЗІМІР МІЦКЕВІЧ, АЛЯКСАНДР МІЦКЕВІЧ, МІХАІЛ ЗАЛІВАКА, АЛЯКСАНДР СТОМА —

стаханаўская брыгада лесарубаў Стаўбцоўскага леспрамгаса.

Разультат неахайнасці

Два разы перапісваліся, здымаліся і вывешваліся зноў спісы выбаршчыкаў на выбарчых участках гор. Косава. Але і пасля гэтага спісы маюць рад істотных недахопаў. У горсовет штодзённа паступаюць заявы выбаршчыкаў аб пропуску іх. З такой заявай прышоў у горсовет старшыня раённай выбарчай камісіі тав. Юшкевіч.

Законна здзіўляліся выбаршчыкі, калі ў спісах, замест сваіх прозвішчаў, яны ўбачылі рыскі. Там, дзе паўтараліся аднолькавыя прозвішчы, саставіцелі спісаў, доўга не задумваючыся, проста паставілі рыскі. Зараз, калі, замест гэтых рысак, напісалі прозвішчы выбаршчыкаў, стварэецца ўражанне, што зроблена выкрэсліванне. А ўсё гэта выклікае шмат непаразуменняў у грамадзян.

Шчыты са спісамі выстаўлены прама на вуліцы, а так як іх не зашклілі, то дождж змывае чарніла і хутка нельга будзе разабраць, што там напісана.

Неахайнасць і паспешнасць (хаця спісы былі вывешаны з двухдзённым спазненнем) прывялі да таго, што спісы выбаршчыкаў трэба перапісваць яшчэ ў трэці раз.

С. Мор.

Выбарчая кампанія ў новых совецкіх рэспубліках і абласцях

16 лістапада працоўныя сталіцы Латвійскай ССР — Рыгі — пачалі вылучэнне кандыдатаў у акруговыя выбарчыя камісіі. Працоўныя рэкамендуюць на гэтую пачэсную работу людзей, якія карыстаюцца ўсеагульным давер'ем.

Рабочыя і служачыя шакаладнай фабрыкі „Кюзе" вылучылі кандыдатам у акруговую выбарчую камісію маладога слесара тав. Фрыцыса Макена. У 1935 годзе тав. Макен 15-гадовым юнакам уступіў у рады комсамола, з таго часу актыўна ўдзельнічае ў рабочым руху. У лютым 1940 года яго арыштавалі і толькі 21 чэрвеня, пасля звяржэння ўлады буржуазіі і памешчыкаў, ён быў вызвалены з турмы.

* * *

У Таліне 16 лістапада адбылася нарада сакратароў павятовых камітэтаў КП(б) Эстоніі. З дакладам аб задачах арганізацый у сувязі з выбарчай кампаніяй выступіў сакратар ЦК КП(б) Эстоніі тав. Н. Каротам.

Дакладчык падрабязна спыніўся на задачах масавай арганізацыйнай работы. Асноўнае — дабіцца, каб кожны выбаршчык ведаў Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах. Буйныя прамысловыя гарады — Таліін, Нарва і іншыя павінны дапамагчы сельскім партыйным арганізацыям у гэтай важнейшай палітычнай кампаніі.

(ТАСС).

Датэрмінова выканалі фінплан 4 квартала

Шэрашэўскі раён на працягу ўсяго года займае перадавое месца па выкананню фінансавага плана. Фінплан 3 квартала раён выканаў на 268,9%, за што атрымаў чырвоны пераходны сцяг аблвыканкома і абкома партыі. Многія фінансавыя актывісты і фінработнікі раёна прэміраваны каштоўнымі рэчамі і грашыма.

Фінансавыя работнікі і актыў моцна трымаюць у сваіх руках пераходны сцяг і не здаюць першынства. Фінплан чацвертага квартала раён выканаў датэрмінова 15 лістапада.

Аблвыканкам, адзначаючы добрую пастаноўку агітмасавай работы сярод насельніцтва і большэвіцкую работу раённых партыйных і совецкіх арганізацый, фінансавых работнікаў і актыва Шэрашэўскага раёна па выкананню фінплана, пакінуў чырвоны пераходны сцяг за раёнам. Адначасова на чацверты квартал для перадавых раёнаў па выкананню фінплана ўстаноўлена пяць грашовых премій: адна ў пяць тысяч руб., адна ў 3000 руб. і тры па 2000 руб. Прэмія ў 5000 руб. прысуджана Шэрашэўскаму раёну адначасова з прысуджэннем пераходнага сцяга.

А. Кудрын.

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Аб назначэнні тав. Валошына І. Ф. Народным Камісарам Дзяржаўнага Кантроля БССР

Назначыць тав. Валошына Івана Філіпавіча Народным Камісарам Дзяржаўнага Кантроля БССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.
За сакратара Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР С. МЕЛКІХ.

16 лістапада 1940 года

ВЫДАННЕ ТВОРАЎ ЯНКІ КУП

Да 35-годдзя літаратурнай дзейнасці народнага паэта БССР Янкі Купалы рэдакцыя юнацкай дзіцячай літаратуры Дзяржвыдавецтва пры СНК БССР выдае дзве кнігі твораў паэта. У першую кнігу на беларускай мове ўваходзяць вершы „Зімою", „Адплата", „Над рэкай Арэсай" і другую кнігу, якая [illegible] рускай мове, у [illegible] „Бандар[illegible]

Кандыдаты сталінскага блока комуністаў і беспартыйных

СЦЯПАН ЧЭРНУХА

...Першамайская раніца 1933 года. Ярка свеціць веснавое сонца. Сярод вёскі Дабучын, на высокім дрэве, горда развяваецца чырвоны сцяг. Людзі павысыпалі на вуліцы, каб паглядзець на сцяг, які прабуджае ў іх сэрцах думкі аб лепшым, свабодным, шчаслівым жыцці. На сценах кожнай хаты расклеены праклямацыі, мноства лістовак раскідана па дарогах.

Неўзабаве ў вёску прыехаў атрад паліцыі. Сцяпан Ільіч Чэрнуха і два яго таварышы па падпольнай комсамольскай рабоце Мароз А. і Плеско І. былі арыштаваны.

— Ты вывесіў сцяг?

— Я нічога не ведаю,—адказаў Сцяпан.

— Цікава, калі гэта ты перастаў ведаць. Вось мы зараз убачым.

Моцным ударам прыкладам вінтоўкі ў грудзі паліцэйскі збіў з ног Сцяпана. Паліцэйскія перарылі ўсё ў хаце Чэрнухі, але нічога не знайшлі і хутка вымушаны былі выпусціць Сцяпана з турмы.

Лета 1933 года. Палявыя сельскагаспадарчыя работы ў поўным разгары. У беларускай вёсцы Дабучын, якая стагнала пад ярмом польскіх памешчыкаў і асаднікаў, бурліць народны рух. На жорсткую эксплуатацыю і нечалавечыя адносіны рэвалюцыйна настроеныя сяляне суседніх вёсак таксама адказалі ўсеагульнай забастоўкай.

Спынілася жніво, касьба і малацьба ў памешчыцкіх маёнтках. Не вышлі на работу батракі. Арганізатарам гэтай сялянскай забастоўкі быў Сцяпан Чэрнуха.

За Сцяпанам пачалі сачыць польскія шпікі і паліцыя. У дом Чэрнухі часцей і часцей пачалі заглядаць нечаканыя начныя госці. Пачаліся допросы, пратаколы, пагрозы, каб Сцяпан выдаў васковых комуністаў і комсамольцаў. Арыштавалі старэйшага брата. А праз некалькі дзён, у красавіку месяцы 1934 года, пры захаванні нелегальнай рэвалюцыйнай літаратуры Сцяпан быў схвачан паліцыяй. Яго выдаў правакатар.

— А, здаецца, стары знаёмы,— сказаў паліцэйскі. — На гэты раз ты не вырвешся з нашых рук. — І з усёй сілай ударыў кулаком у твар Сцяпана. Потым павалілі яго на зямлю і паліцыянт стаў каленямі на грудзі. За Сцяпана ўступілася старая маці.

— А пакрыў, таксама комуністка.

Яе цяжка збілі і яна хутка памёрла.

Доўга білі на гэты раз Сцяпана.

— Прызнайся, хто яшчэ з табой сядзіць у комсамольскай арганізацыі, — мы цябе адпусцім на волю!

— Я нічога не скажу, хоць забіце на месцы.

У польскай дыфензіве на гэты раз Сцяпана асудзілі на 8 год турэмнага зняволення. Сяляне навакольных вёсак абралі спецыяльную делегацыю і прасілі выпусціць Сцяпана. Падалі апеляцыю ў вышэйшыя судовыя органы. Але там ведалі, з кім маюць справу. Сцяпану, замест памілавання, яшчэ дабавілі чатыры месяцы турэмнага зняволення і перавялі з пружанскай у равіцкую турму, куды адпраўлялі асабліва небяспечных для польскай дзяржавы людзей.

У равіцкай турме Чэрнуха Сцяпан сустракаецца з Прытыцкім, Пацярухай і другімі віднымі рэвалюцыйнымі дзеячамі. Тут ён знаёміцца з творамі класікаў марксізма-ленінізма.

Гэтыя сустрэчы з старымі загартаванымі рэвалюцыянерамі і вывучэнне марксісцка-ленінскай тэорыі яшчэ больш умацавалі веру Сцяпана ў перамогу комунізма.

У верасні 1939 года ён атрымаў свабоду. Сцяпан вяртаецца ў сваю родную вёску Дабучын. З гэтага моманту пачынаецца сапраўднае жыццё, аб якім так горача марыў, за якое змагаўся і сядзеў доўгія годы ў турме Сцяпан. Працоўныя сяляне вёскі Дабучын аднагалосна выбіраюць яго старшынёй сялянскага камітэта.

З уласцівай яму энергіяй і рэвалюцыйным запалам бярэцца Сцяпан за ўстанаўленне совецкай улады ў вёсцы. Правялі размеркаванне памешчыцкай зямлі, наладзілі ахову гаспадарчых каштоўнасцей уцёкшых памешчыкаў, арганізавалі работу школы.

Летам бягучага года Чэрнуха Сцяпан быў паслан на абласныя кароткатэрміновыя курсы старшынь сельсоветаў. Пасля іх сканчэння ён едзе працаваць старшынёй найбольш адсталага ў раёне Ліноўскага сельсовета.

Ён цалкам аддаецца гэтай рабоце. За кароткі час здолеў згуртаваць сельскі актыў у 30 чалавек. Апіраючыся на гэты актыў, Чэрнуха здолеў так паставіць работу, што сельсавет першым у раёне датэрміпова выканаў план хлебапаставак і бульбапаставак, паспяхова заканчвае выкананне фінплана.

Працоўныя сельскага совета любяць і паважаюць Чэрнуху. Зараз ён арганізаваў гурток маладых выбаршчыкаў і рэгулярна праводзіць заняткі. Наладжвае масавыя чыткі газет, калектыўнае слуханне радыёперадач.

Быў многалюдны сход працоўных Ліноўскага сельсовета. Вылучалі кандыдатаў у абласны Совет депутатаў працоўных. Прысутныя спынніліся на кандыдатуры Сцяпана Ільіча Чэрнухі, былым бедняку вёскі Дабучын, актыўным змагару за народную справу.

Зала дружна апладыравала. Прапанова атрымала ўсеагульнае адабрэнне і падтрымку.

Сцяпан Ільіч упершыню ў сваім жыцці адчуў такую вялікую радасць ад усведамлення таго, што працоўныя сельсовета так аднадушна яму даверяюць. Шум апладысментаў, воклічы ў чэсць правадыра народа, вялікага Сталіна, які даў радаснае і шчаслівае жыццё, доўга не змаўкалі ў зале.

Сцяпан Ільіч Чэрнуха перацярпеў на сваім жыцці некалькі арыштаў, катаванняў, судоў і ўсе гэтыя пыткі ён стойка, мужна перацярпеў, а на гэты раз ледзь утрымаў слёзы.

Я бязмежна рад, што вы мне аказалі такое вялікае давер'е. У адказ на давер'е я запэўняю вас, што ўсё сваё жыццё аддам за працоўны народ, за яго шчасце, чэснай, адданай работай абавязуюся апраўдаць аказанае давер'е.

Ф. Кавалёў.

Кандыдаты ў дэпутаты сельскага совета

У Лышчыцкім сельсавеце, Брэсцкага раёна, праходзіць вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты сельскага совета дэпутатаў працоўных. Сяляне вылучаюць у совет лепшых актывістаў, адданых партыі Леніна-Сталіна і совецкаму ўраду.

З вялікай актыўнасцю прайшоў прадвыбарчы сход у вёсцы Лышчыцы. Выбаршчыкі сур'ёзна і па-дзелавому абмяркоўвалі кандыдатаў у дэпутаты сельскага совета. Першым узяў слова селянін Сцяпан Сямідарчук. Ён прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты сельскага совета селяніна Івана Ігнацьевіча Нерода. Затым выступае селянін Павел Андрэюк, які падтрымлівае прапанову тав. Сямідарчука.

Сход аднадушна вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты сельскага совета Івана Ігнацьевіча Нерода, Ніну Емельянаўну Нерода і Івана Карпавіча Курылюка. Усе яны з'яўляюцца актыўнымі грамадскімі работнікамі і перадавікамі ў выкананні сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Арганізавана прайшоў прадвыбарчы сход сялян вёскі Янова. Кандыдатамі ў дэпутаты сельскага совета сяляне вылучылі Іосіфа Іосіфавіча Пятроўскага, члена сельсовета, актыўнага грамадскага работніка, які забяспечыў датэрміновае выкананне абавязацельстваў перад дзяржавай па сваёй вёсцы і правяў вялікія клопаты аб школе. На гэтым-жа сходзе кандыдатам у дэпутаты сельскага совета вылучан таксама актывіст Балеслаў Іванавіч Барташевіч.

М. Гурэвіч.

Дастойны народнага давер'я

Сухі і цёплы стаяў верасень. Пасля змрочнай, смярдзючай камеры паветра п'яніла, ад сонца на вачах выступалі слёзы. А можа быць гэта былі слёзы радасці? — скончыўся тэрмін заключэння многіх год. Ён пайшоў прама з турмы дамоў у сваё роднае сяло Гічыцы.

Гэта было 2 верасня. У кругу сваякоў было непрывычна радасна і лёгка. Але ў паветры адчувалася набліжэнне вялікіх падзей і Свергуна пацягнула да дзейнасці, да таварышоў па падполлю, з якімі пройдзена нямалая дарога.

І вось ён разам з Лахеем, Казаком, Вішнеўскай у адным з маленькіх домікаў пасёлка Івацевічы слухаюць па радыё прамову главы Совецкага ўрада таварыша Молатава аб тым, што Чырвоная Армія выступіла на абарону сваіх брацкіх народаў па крыві. Гэта было сігналам да дзеяння. Маленькая група фарміруе атрад. Баявая задача — у дапамогу роднай Чырвонай Арміі тут, на месцы, з другога канца расчышчаць шлях. І ў гэту-ж ноч адбылося паўстанне. Атрад Аляксандра Свергуна разбройваў рэшткі польскай ваеннічны. Закончыўшы з гэтым, прыступілі да аднаўлення парадку.

А праз тры дні сустракалі доблесную Чырвоную Армію, сустракалі, як свята, роўнага якому яшчэ не было ў жыцці прыгнечаных.

Дні і ночы напаўняліся важнейшымі дзяржаўнымі справамі. Роднае сяло Гічыцы паслала яго сваім дэпутатам у Народнае Сабранне. Сяляне з нецярпеннем чакалі зямлі, зямлі, аб якой марылі ўсё сваё жыццё. Трэба ле было дзяліць правільна, справядліва. І яшчэ трэба было: наладжваць вучобу ў школах, ахову лясоў, каштоўнасцей былых паноў, якія павінны дастацца народу.

З Унечарговай V сесіі Вярхоўнага Совета СССР Аляксандр Грыгор'евіч звярнуўся ў свае блізкія месцы, акрылены новымі планамі, перспектывамі, ахоплены небачаным працоўным энтузіязмам, поспехам перамог совецкага народа.

Аб усім гэтым ён не пераставаў расказваць на многалікіх сходах, мітынгах сялянам, рабочым, саматужнікам, якія з захапленнем слухалі яго словы большавіцкай праўды.

* *
*

Да старшыні Косаўскага гарадскога совета прыходзяць штодзённа настаўнікі, сяляне, служачыя розных устаноў. Яны ідуць да яго, як да дэпутата Вярхоўнага Совета БССР, за вырашэннем розных пытанняў. Прыходзяць, як да таварыша, якога ведаюць многія, за парадай, выслухаць яго погляд.

У жыцці горада за час работы тав. Свергуна як старшыні гарадскога совета многае змянілася. Пачата азеляненне вуліц, капітальна адрамантаван і расшыран кінатэатр, забрукавана новая маставая на 3.000 метраў, пракладзены новыя тратуары, перакладваюцца старыя, ліквідуюцца „сляпыя" вуліцы і завулкі, якія перашкаджалі нармальнаму руху ў горадзе, адрамантаван гарадскі басейн і інш.

Аляксандра Грыгор'евіча Свергуна вылучылі сваім кандыдатам у дэпутаты раённага совета выбаршчыкі Горкаўскай выбарчай акругі.

Жыццё гэтага чалавека, сына бедняка-селяніна, мужная барацьба яго за інтарэсы народа — лепшая парука, што ў органах совецкай улады ён будзе і надалей наўпільна прадаўжаць справу партыі Леніна-Сталіна, справу ўсяго перадавога чалавецтва.

С. Сураўцова.

Косаў.

Агітатары г. Баранавічы падбіраюць неабходную ім літаратуру ў бібліятэцы абласнога Дома партасветы.

Фота В. Лупейка.

Фотахроніка Белта.



Пасяджэнне ўчастковай выбарчай камісіі Н-скай часці ЗахАВА. У цэнтры — старшыня камісіі ст. лейтэнант П. К. Міхайлаў.

Фотахроніка Белта.

СУСТРЭЧА

Да стала, за якім сядзеў прэзідыум схода, адзін за другім падыходзілі прамоўцы. Яны гаварылі прыгожай народнай мовай, з пачатку хвалюючыся, але пасля першых мінут стройным руслом плялі словы, упэўнена гучэў голас.

Калі папярэдні прамоўца скончыў, з-за лаўкі падняўся стары селянін. На ім быў аблезлы аўчынны кажушок з чорным авечым каўнерам. Ён узняў угору правую, кастлявую руку, а другой прытрымліваў акуляры.

—Таварышы, дайце мне слова.

— Слова мае тав. Карнелюк, агітатар з вёскі Гвоздзіцы, — сказаў старшыня схода.

Стары ўпэўнена падыйшоў да стала, акуратна расправіў невялічкі кавалачак паперы і, прытрымліваючы, каб не спалі акуляры з носу, спакойна пачаў прамову.

— Сабраліся мы для вельмі важнай справы, — гаворыць тав. Карнелюк,—сустрэцца са сваім кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета тав. Амілаевым Пракофіем Ігнацьевічам. Мы прыехалі сюды з дзесяткаў вёсак, каб пазнаёміцца, пагаварыць са сваім кандыдатам, паслухаць хто ён такі, чым займаецца і што думае, расказаць аб сабе, запытаць параду.

—Мы ўсебакова павінны ведаць нашага будучага дэпутата, нашага слугу,—як сказаў таварыш Сталін. Вось тут даверанныя выступалі, гаварылі аб кандыдаце. І можна сказаць, што мы не памыліліся. Наш кандыдат дастойны чалавек. Самае галоўнае — гэта рабочы чалавек. Ён вось з гэтых пяці пальцаў здабываў сабе кавалак хлеба. Тав. Амілаеў абараняў нашу радзіму, не раз падвяргаючы сваё жыццё смяротнай небяспецы.

—Зразумела, што ён дастойны кандыдат. І зараз на рабоце пракурора абласці ён апраўдвае вялікае давер'е, абаранае нашу радзіму ад пасягацельстваў ворагаў, якія яшчэ і ў нашых радах не вывеліся.

—15 снежня я, сумесна са сваімі выбаршчыкамі, прыду на выбарчы ўчастак і прагаласую за нашых лепшых сыноў народа— пасланцоў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

У заключэнне я хачу прасіць нашага кандыдата, каб ён і ў далейшым быў бязлітасным да ворагаў і ахоўваў інтарэсы нашай краіны.

Апошнія словы прамоўцы выклікалі апладысменты ў зале. Стары выказаў за многіх іх думкі і пачуцці. Аднак прысутныя сяляне прасілі слова і гаварылі амаль аб адным і тым-жа, што іх кандыдат дастойны народнага давер'я і яны будуць за яго галасаваць.

Выступіў кандыдат у дэпутаты ад Маларыцкай выбарчай акругі па выбарах у абласны Совет тав. Амілаеў Пракофій Ігнацьевіч.

— Да глыбіні душы расчулілі мяне вашы словы,—гаворыць ён, — я даю абяцанне быць дастойным кандыдатам.

Я. Омскі.

Маларыта.

Фельчар Аня Варанчук

[illegible] зялёны домік з белымі [illegible] быццам урос паміж [illegible] акацый і ліп. У 100 метрах ад доміка паласкаліся ў адлегла берагі невялічкія хвалі возера Олтуш. Хвалі лёгка пакачвалі човен з двума хлопчыкамі, лавіўшымі рыбу.

— Пеця, глянь, хтосьці пад'ехаў.

Узлахмачаная галоўка павярнулася ў бок берагу і на мінуту застыгла.

— Хто-ж гэта да нас у госці задумаў?

З берагу рослая дзяўчына махала рукой і клікала рэбят да сябе. Хлопчыкі з нездавальненнем пакінулі сваю работу і павінаваліся яе просьбе. Калі яны наблізіліся да берагу, прыемным голасам дзяўчына, паказваючы рукой на домік, спытала:

— Гэта вы тут жывеце?

— Так. Амаль хорам смела адказалі рэбяты.

— А ключ у вас?

— Можа пані вярнулася, — шопатам спытаў малодшы хлопчык у старэйшага.

— Ды не, што ты, гэта не пані. Пані старая, злючая, ды і не вярнуцца ёй сюды. Пабаіцца чырвонаармейцаў.

Дзяўчына была ўжо на парозе доміка. Паўразваленая пліта, абарваная, зацягнутая павуцінням [illegible] брудная падлога, закопвялікіх карых вачах. Дзяўчына яшчэ раз уважлівым позіркам аглядзела гэты невялікі пакой, і ён паказаўся ёй больш панурым і цёмным. Яна хацела павярнуць назад, уцячы адсюль, як раптам ззаду яе раздаўся ціхі жаночы голас.

— Дзень добры!

Дзяўчына павярнулася і перад ёй апынулася пажылая сялянка. Глыбокія маршчыны збараздзілі яе твар, перакошаны ад болю. Сялянка працягвала.

— Гэта вы будзеце доктарша? Трэці тыдзень хварэю жыватом. Усіх мясцовых лекараў клікала і нічога не дапамагае. Можа бог вас прыслаў мне на дапамогу...

Вочы дзяўчыны зноў загарэліся аганьком маладосці. І ў гэтых вачах можна было прачытаць ужо не страх, а рашучасць змагацца і перамагаць. „А яшчэ комсамолка, — думала яна, — а спужалася цяжкасцей. Уцякаць збіралася, тады калі тваёй дапамогі чакаюць сотні людзей".

Сялянка ўважліва аглядала „доктаршу". Такая маладая. Няўжо яна што-небудзь разумее". Але яе думкі перабіла дзяўчына.

— Раздзявайся бабуля, пагледзім што ў цябе.

— Так пачалася практыка маладога совецкага фельчара-комсамолкі Анны Сцяпанаўны Варанчук. У першы дзень свайго прыезда ў Папяклі дні напоўненыя вялікай удзячнай работай. Жывая, энергічная, з юнацкай страсцю яна аддавала сябе поўнасцю вялікай справе — ахове жыцця і здароўя вызваленых грамадзян. Сумесна з гэтым Аня прынялася за абсталяванне фельчарска-акушорскага пункта, загадчыкам якога яна з'яўляецца.

Вестка аб арганізацыі ў Олтушы фельчарска - акушорскага пункта маланкай абляцела навакольныя сёлы і хутары. Аб маладой совецкай фельчарыцы - комсамолцы Ані гаварылі ўсе ад малога да вялікага. Людзей, для якіх урач і медыцынская дапамога былі раней чымсьці недасягальным, увага і любоў да хворых, добрасардэчнасць медыцынскага работніка кранулі да глыбіні душы.

Аня стала сваім чалавекам у вёсцы. Да яе прыходзілі лячыцца, прыходзілі за парадай, як да вопытнага чалавека, так прыгожа расказваючага аб буднях совецкіх грамадзян. За кароткі час яна заваявала сімпатыі сялян і асабліва жанчын.

Яе называюць проста „Анечкай" і ў гэтым ласкацельным суготчы ўкладзена вялікая мацярынская любоў.

* *
*

[illegible] ноч [illegible] ла з ложка. Хто там? — спытала яна. Дрыжачы голас з вуліцы адказаў:

— Адчыніце, няшчасце здарылася.

Аня адкрыла дзверы і ўпусціла ў дом селяніна абмоклага з ног да галавы. Не чакаючы пытанняў, селянін пачаў расказваць.

— Я з Нікольскага. Сын зламаў нагу, везці на падводзе нельга. Прашу вас акажыце яму дапамогу.

Доўга Аню не прыйшлося ўгаварваць. Аказаць дапамогу хвораму — гэта яе доўг, совецкага медыцынскага работніка. За некалькі мінут яна сабралася ў дарогу, захапіўшы з сабой маленькі чамадан, у якім знаходзіліся інструменты, медыкаменты і бінты.

Дождж павялічваўся. Селянін прапанаваў фельчару сваю світу, але яна адмовілася. Чорная гразь прыліпала да калёс і, здаецца, паўмысна затрымлівала фельчара. Аня і селянін амаль усю дарогу ехалі моўчкі, кожны думаючы аб сваім.

Досвіткам была аказана неабходная дапамога хвораму. Узрадаваныя бацькі не ведалі чым аддзякаваць дзяўчыне. Яны прапанавалі сала і яйкі, але яна рашуча ад усяго адмовілася.

— Мне дзяржава грошы плоціць, каб я лячыла хворых.

— Не пайму вас, паненачка — сказаў селянін фельчарыцы. Ночу ў дождж за 15 кілометраў [illegible] едзеце на падводзе да хвораго, калі за вашу працу хочуць [illegible] не менш 50 злотых. Растлумачце мне, чаму гэта так. Ці вам так многа плоцяць грошай?

— Зразумела, вам цяжка гэта ўспрыняць. Мы совецкія людзі працуем не для нажывы. Палічыце,—працягвае прыўзнята далей Аня, — колькі на мяне затраціла дзяржава, каб навучыць прафесіі, то атрымаецца даволі вялікая сума. Мая работа — плата радзіме за клопаты і навуку.

І у дзесяты раз дзяўчына расказвала пра свой просты шлях ад радавой сялянкі да медыцынскага работніка, шлях, які адкрыт Сталінскай Канстытуцыяй мільёнам совецкіх юнакоў і дзяўчат.

...Да рэвалюцыі бацькі Ані былі малазямельнымі сялянамі. Зараз яны члены сельскагаспадарчай арцелі імені Леніна Магілёўскай абласці. Пасля сканчэння 7-годкі, Аня 2 гады працуе ў калгасе: з пачатку загадчыцай полаў, а пасля звеннявой. Звяно Варанчук лічылася лепшым у калгасе. Яно заўсёды перавыконвала нормы.

Але маладую дзяўчыну цягне да ведаў, і яна едзе вучыцца ў бабруйскую фельчарскую школу, якую заканчвае на „выдатна." З вялікім задавальненнем тав. Варанчук сустрэла прапанову аб пасылцы яе ў заходнія вобласці Белар[illegible]

* *

[illegible] акацый і ліп. Ве[illegible] леністы хвалі [illegible] На фоне агалёў[illegible] ырысоўваюцца [illegible]ка. Здаецца [illegible] і вялі[illegible]ра гляджаць на ўспененае возера і невя[illegible]лікі, па-асеннему хмуры, парк.

Сакратар Маларыцкага райкома партыі тав. Каламеец, паказваючы на абсталяваны будынак фельчарскага пункта гаворыць.

— Маладзец дзяўчына. Пагляджаце, які ўзорны парадак, якая чыстата.

Тут-жа пры амбулаторыі [illegible] невялікім пакойчыку жыве фельчар са сваімі папругамі — зубным урачом Кацей і акушоркай Еленай.

Ані мы дома не засталі. Елена нам расказала, што яшчэ мінулай ноччу яе выклікалі да цяжка хворай жанчыны і вось ужо суткі яна дзяжурыць каля яе. Фельчара мы знайшлі ў сельсавеце ўсхваляванай ля тэлефона. Яна выклікала хуткую дапамогу з Брэста і [illegible] пакоілася толькі тады, калі сакратар райкома прапанаваў [illegible] паслуг хворай сваю машыну.

Разгаварыліся. Аня расказвала аб выдатных будніх, вялікай рабоце зробленай у палесскай вёсцы. Аб сабе Аня менш за ўсё гаворыць. А львіная доля новага ў Олтушы належыць ініцыятыўнай комсамолкі-грамадскага работніка тав. Варанчук. Яна не толькі медыцынскі работнік, але страсны агітатар і прапагандыст новага жыцця, барацьбіт за ператварэнне забітай вёскі ў новую, соцыялістычную, барацьбіт за шчаслівае і радаснае жыццё.

І нездарма выбаршчыкі 8 Олтушскай выбарчай акругі [illegible] чылі яе кандыдатам у дэп[illegible] Маларыцкага раённага Совета.

Я. Зар[illegible]

Олтуш, Маларыцкі раён.

Кандыдат на Ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку 1941 года, лепшы конюх калгаса імені НКУС (Мінскі раён) І. І. Петрыкевіч са сваімі жіромцамі—жарабцамі „Воранам" і „Артылерыстам". За час сваёй работы конюхам тав. Петрыкевіч вырасціў для РСЧА дзесяткі добрых коней.

Фота І. Шышко. *Фотахроніка Белта.*

Да зімы не падрыхтаваліся

У калгасе імені Варашылава, Косаўскага раёна, больш 250 галоў жывёлы: коней, кароў, авец, свіней. Грамадская жывёла патрабуе вялікіх клопатаў і асабліва зімой. З вясны праўленне калгаса праявіла каштоўную ініцыятыву — распачало будаўніцтва кароўніка, але давесці справу да канца не здолела. Кароўнік не дабудаван, і жывёла застаецца стаяць у старым хлеве, які не ацеплён.

Кіраўніцтва калгаса не паклапацілася зрабіць і кармушкі. Корм жывёле кладзецца прама пад ногі, добрая яго палова гіне даремна. Па падліках аказалася, што на зіму не хопіць каля 20 тон сена. Як выйсці з такога становішча, праўленне яшчэ не рашыла. Між іншым, частка калгаснага сена незаконна папала аднаасобнікам, якія скасілі траву, адведзеную калгасу. Праўленне калгаса перадала справу пракурору, якая яшчэ не разгледжана.

Падрыхтоўка да зімоўкі жывёлы неразрыўна звязана з пытаннямі арганізацыі працы на жывёлагадоўчых фермах. У калгасе прымацаваны сталыя людзі да коней, авец і свіней. І кожнаму калгаснику зразумела, што гэта дало вялікую карысць. Асабліва стала прыкметна на свінаферме. У свінарніку цёпла, свіней добра кормяць, яны хутка растуць. Затое буйная рагатая жывёла закінута. Тут поўная абязлічка. Ніхто не адказвае за тое, ці сыты каровы, ці не прападае даремна корм. З гэтым трэба рашуча пакончыць. Выдзяленне сталых даярак, арганізацыя сярод іх социялістычнага спаборніцтва за лепшыя паказчыкі ў рабоце дапамогуць захаваць жывёлу і прыплод.

Вялікая віна за ўсе гэтыя зрывы і недаробкі кладзецца не толькі на праўленне калгаса, але і на Косаўскі райземаддзел. Загадчык райземаддзела Адзінец і агранам Анішчук бываюць у калгасе вельмі часта. Як маглі яны прайсці міма такіх сур'ёзных недахопаў? Аказваецца, уся бяда ў тым, што яны зусім няправільна разумеюць свае функцыі.

Калі пытаешся ў калгаснікаў, як дапамагае ім райземаддзел, яны адказваюць:

— Работнікі райза капалі бульбу разам з намі (?)

Да рэчы, і райком партыі, і райвыканком вельмі ахвотна арганізоўвалі суботнікі па ўборцы бульбы ў гэтым калгасе, але не дапамаглі правільна арганізаваць працу, наладзіць учот і социялістычнае спаборніцтва.

Зараз асноўная задача калгаса — падрыхтаваць жывёле нармальныя ўмовы на стойлавы час. Праўленню, старшыні тав. Трацяку трэба праявіць настойлівасць і ініцыятыву, каб у самы кароткі тэрмін адрамантаваць і ацяпліць кароўнік, загатовіць кармушкі. Справа райземаддзела наладзіць чоткі, штодзённы кантроль за дзейнасцю калгаса.

М. Афанасенка,
інструктар Косаўскага райкома партыі.

ЛЮБІМЫ ПІСЬМЕННІК

У Н-скай часці вялікай любоўю сярод чытачоў—байцоў і камандзіраў—карыстаюцца творы вялікага рускага пісьменніка Льва Нікалаевіча Талстога. Яго творы „Васкрасенне", „Вайна і мір", „Казакі", „Пасля бала" і ў асаблівасці „Анна Карэніна" ніколі нельга знайсці на бібліятэчных паліцах: яны ўвесь час на руках, пераходзяць ад аднаго чытача да другога па строгай чарзе.

Часта начальніку бібліятэкі, малодшаму палітруку тав. Кузнякову чытачы задаюць пытанне: „Чаму ў бібліятэцы ніколі няма твораў Талстога?" Начальнік бібліятэкі, усміхаючыся, адказвае: „Нічога не магу зрабіць. Такі Леў Нікалаевіч".

Асабліва зачытваюцца творамі Талстога палітработнікі. Старшы палітрук тав. Жарын заяўляе: „Самым любімым творам з'яўляецца раман „Анна Карэніна." Напрыкладзе Анны Карэнінай, затраўленай свецкім грамадствам, я паказваю байцам бяспраўе і трагізм рускай жанчыны, не здольнай прыстасоўвацца, маніць і двудушнічаць; паказваю ўсю сістэму эксплаатацыі, знявагі і здзекаў, якія панавалі ў старай Расіі."

Палітрук тав. Сухавей гаворыць: „Я набыў у асабістае карыстанне амаль усе творы Талстога. Я люблю яго за непрымалёваны паказ змрочнай рускай сапраўднасці, за яго непаддзельную шчырасць і прамату пры паказе жыцця."

Гарачая любоў чытачоў да твораў Льва Нікалаевіча Талстога —лепшы помнік вялікаму пісьменніку рускай зямлі.

М. Пармон.

Па-за ўвагай гаркома комсамола

З 10 лістапада пры Брэсцкім гарадскім камітэце фізкультуры арганізаваны курсы грамадскіх інструктараў фізічнай культуры.

На курсах тры аддзяленні: гімнастыкі, рукапашнага бою і лыжнага спорту.

Як недахоп гэта тое, што гарадскі камітэт комсамола і пярвічныя арганізацыі самаўхіліліся ад аказання дапамогі гарадскому камітэту фізкультуры і спорту ў рабоце курсаў. Аб гэтым гаворыць такі факт. На курсах павінна было займацца 75 чалавек, займаецца 40. Ні адзін чалавек не падабран на курсы па лініі комсамольскай арганізацыі, хаця абяцанняў з боку сакратара ГК ЛКСМБ тав. Арцем'ева было многа.

Н. Петроўскі.

Прызыў моладзі ў рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА

РАДАСЦЬ МОЛАДЗІ

Косава. Перад камісіяй па прызыву моладзі ў рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА стаіць 14-гадовы юнак Іван Хаванскі. Старшыня раённай прызыўной камісіі тав. Танчэўскі звяртаецца да яго з запытаннем:

— Дзе жадаеце вучыцца?

— Я жадаю быць будаўнікам.

Прызыўная камісія задавальвае просьбу Хаванскага і выдае яму пуцёўку ў Гайнаўскую школу ФЗА будаўнікоў.

У калідоры сярод шумнага натоўпу рэбят стаіць Фёдар Лапуха, сын селяніна з вёскі Харошча. Ён толькі што атрымаў пуцёўку ў Брэсцкае рамесленае вучылішча. Яго радасці няма межаў. Хвалюючыся, Лапуха абяцае, што закончыўшы вучылішча ён абавязкова будзе стахановцам.

Міх. Панкоў.

З вялікай радасцю ідуць маладыя юнакі на прызыў

Два дні ў раённым центры Жабінка праходзіць прызыў моладзі ў рамесленыя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння. З самага ранку радасныя юнакі збіраюцца ў памяшканні раённага камітэта комсамола, дзе знаходзіцца прызыўны пункт.

Уважліва правярае камісія прызыўнікаў. Кожны прызыўнік падвяргаецца дасканаламу медыцынскаму агляду, затым камісія цікавіцца яго пісьменнасцю і жаданнямі ў набыцці кваліфікацыі. Толькі пасля таго, як камісія добра азнаёміцца з прызываемым, прымаецца адпаведнае рашэнне.

Вось да стала камісіі падыходзіць сын селяніна-бедняка з вёскі Рачыш Владзімір Нікалаевіч Паўлючук. Ён окончыў 4 класы пачатковай школы.

—З Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб стварэнні працоўных рэзерваў знаём? — пытае старшыня прызыўной камісіі тав. Давыдаў.

— Знаём,— адказвае Владзімір, і далей дадае: „Прашу паслаць мяне ў рамесленае вучылішча."

Яго просьбу камісія задавальняе.

Рослы і шустры юнак Владзімір Шэйда з вёскі Дзягні любіць майстраваць. Яму 15 год.

— Якую спецыяльнасць хочаш набыць? — пытае камісія ў Владзіміра.

— Я вельмі люблю сталярскую работу. Для мяне майстраваць—гэта ўсё. Калі вы пашлеце мяне ў рамесленае вучылішча, то я абяцаю апраўдаць давер'е партыі і ўрада.

Камісія рашыла прызваць Валодзю Шэйда ў Брэсцкае рамесленае вучылішча.

— Ваша прозвішча Дубіна!?— пытае тав. Давыдаў.

— Так, Дубіна Аляксандр Паўлавіч, — адказвае малады комсамолец.

— Гэта ваш бацька працаваў на будаўніцтве Днепра-Бугскага канала, — пытае старшыня.

— Правільна, — адказаў Аляксандр.

— Выдатна, па-стахановску працаваў твой бацька, з яго бралі прыклад усе будаўнікі,—гаворыць старшыня райвыканкома.

Цяга моладзі ў рамесленыя вучылішчы і школы ФЗА выключна вялікая. Жабінкаўскі раён павінен паслаць 40 юнакоў у вучылішчы і школы, а жадаючых налічваецца сотні. 17 лістапада толькі з аднаго Рагазянскага сельсовета на прызыў з заявамі з'явілася 30 чалавек.

За два дні камісія залічыла 17 чалавек у рамесленыя вучылішчы і 7 чалавек у школы фабрычна-заводскага абучэння.

Побач з дадатнымі стараннямі ў рабоце камісіі трэба адзначыць і недахопы. Калі такой прызыўной камісіі абсталяван нядрэнна, то такой, у якім чакаюць юнакі, не абсталяван, як гэта патрэбна. У ім нават не хапае стулляў, і прызыўнікам прыходзіцца гадзінамі стаяць і чакаць выкліку. Не арганізавана на пункце і культмасавая работа сярод прызыўнікаў. Многім юнакам не растлумачылі, што прызыў у іх раёне праводзіцца толькі ў рамесленыя вучылішчы і школы ФЗА.

І. Летні.

У Мінскай школе ФЗО камунальнікаў Наркамгаса, якая рэарганізуецца ў школу ФЗА будаўнікоў, добра пастаўлена абаронная работа.
На здымку: заняткі страдковага гуртка, кіруе гуртком Б. Л. Лакс.

Па гарадах Совецкага Саюза. Гарадскі тэатр у Тарту (Эстонская ССР)

Фізкультура і спорт

Лыжны спорт выхоўвае смеласць і адвагу

У сістэме совецкай фізкультуры адно з важнейшых месц займае лыжны спорт. Прагулкі і экскурсіі на лыжах, лыжныя пераходы, лыжныя спаборніцтвы павінны знайсці шырокае распаўсюджанне сярод працоўных нашай вобласці, як сродак здаровага і культурнага адпачынку і падрыхтоўкі да социялістычнай працы і абароны. Лыжны спорт— адзін з лепшых сродкаў умацавання здароўя.

Рух на лыжах ва ўмовах жорсткага марознага паветра ўдасканальвае дзейнасць унутраных органаў, умацоўвае серца, выпрацоўвае поўнае і глыбокае дыханне, паляпшае абмен рэчываў у арганізме.

Заняткі лыжным спортам роўнамерна развіваюць мускулатуру, павялічваюць мускулістую сістэму, выпрацоўваюць лоўкасць і здольнасць да працяжнай інтэнсіўнай работы. Хадзьба на лыжах у перасечанай мясцовасці, цяжкія пад'ёмы, імклівыя спускі, нечаканыя павароты, прыжкі з трампліна выхоўваюць смеласць, адвагу, рашучасць, хуткасць, арыентыроўку і іншыя каштоўныя якасці.

Асабліва вялікае значэнне мае лыжны спорт у абароне краіны. Зімой дзеянні пяхоты скоўваюцца, перасоўванне магчыма толькі па дарогах. Бездапаможан той баец, які не ўмее хадзіць на лыжах. Уменне хадзіць на лыжах невымяральна павялічвае баявую здольнасць байца.

Слаўную старонку ў гісторыі совецкай фізічнай культуры ўпісалі майстры-лыжнікі, змагаўшыяся на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай. Незлічымы баявыя эпізоды, у якіх байцы спалучалі мужнасць і лоўкасць з высокім лыжным майстэрствам, з бязмежнай любоўю да социялістычнай радзімы.

Формы занятак лыжным спортам рознастайны. Катанне з гор, невялікія прагулкі, турысцкія паходы, спартыўныя спаборніцтвы, прадастаўляюць самы шырокі выбар для жадаючых займацца лыжным спортам. З 8-ю трэніровачных прагулак магчыма падрыхтавацца настолькі, каб здаць лыжныя нормы на значок ГПА першай ступені.

Усё большае значэнне набывае лыжны спорт, як сродак лячэння і загартоўкі. Вынікі прымянення лыжных прагулак для лячэння многіх відаў захворванняў вельмі эфектыўны, у асаблівасці ў лячэнні лёгачных захворванняў.

Роўнамерныя рытмічныя рухі, ахопліваючыя ўсю мускульную сістэму, маючыя месца пры хадзьбе на лыжах, служаць адным з лепшых сродкаў барацьбы за захаванне сіл і здароўя чалавека. Лыжнікі не ведаюць прастудных захворванняў, ім чужды стомленасць, яны надоўга захоўваюць сваю сілу. Удзел у спартыўных спаборніцтвах лыжнікаў старэй сарака год узросту ўжо перастаў быць рэдкасцю.

Не меншае значэнне мае лыжны спорт, як сродак фізічнага выхавання дзяцей. Кожны, хто жадае, каб яго дзіця вырасла здаровым, сільным выносліым, будзе клапаціцца аб яго фізічным выхаванні і ў прыватнасці пры дапамозе лыжнага спорту. Усямернае садзейнічанне развіццю лыжнага спорту аказваецца ў нашай краіне.

Наша задача — зрабіць усё неабходнае, каб своечасова пабудаваць лыжныя станцыі, сустрэць зіму ў поўнай гатоўнасці.

У нашай вобласці ў гэтым годзе будзе створана 18 лыжных раённых станцый з колькасцю лыж — 7 тысяч пар.

У Ружанскім раёне арганізавана вытворчасць лыж. Кожная сям'я павінна набыць для моладзі і дзяцей у асабістае карыстанне лыжы, маючыя вялікае значэнне ў быту і абароне краіны.

Г. Фіялкін.

У АБЛВЫКАНКОМЕ

На сваім пасяджэнні аблвыканком разглядзеў пытанне аб развіцці лыжнага спорту ў вобласці. У рашэнні, прадугледжаны практычныя мерапрыемствы на 1941 год.

У раённых центрах— Кобрыне, Пружанах, Гайнаўцы, Сямяцічах, Косаве будуць арганізаваны лыжныя базы з колькасцю 200 пар лыж у кожнай. У гэтых-жа раёнах прадугледжана арганізаваць перасовачныя лыжныя базы.

У такіх раёнах, як Бярозаўскі, Высокаўскі, Клышчэльскі, Дывінскі, Жабінкаўскі, Поразаўскі, Шэрашэўскі, Ружанскі, Маларыцкі, Камянецкі, Дамачэўскі, Антопальскі, будуць арганізаваны лыжныя станцыі. Кожная з станцый будзе мець 200 пар лыж. Пры ўсіх поўных сярэдніх школах прадугледжана стварыць лыжныя пункты з наяўнасцю ў кожным 50 пар лыж. Пры няпоўных сярэдніх школах лыжныя пункты будуць мець па 25 пар лыж.

У гор. Брэсце прадугледжана пабудаваць вучэбны трэніровачны трамплін для прыжкоў на лыжах.

Аблвыкаўкам абавязаў дырэкцыю Ружанскага райпромкамбіната зрабіць 7 тысяч пар лыж для масавага абучэння працоўных лыжнаму спорту. У рашэнні прадугледжана і рад іншых мерапрыемстваў, як правядзенне масавых ваенізаваных паходаў на лыжах, падрыхтоўка кадраў для лыжнага спорту і інш. У канцы студзеня 1941 года абласному камітэту фізкультуры даручана правесці абласную ваенізаваную лыжную эстафету.

Рашэнне абавязвае райвыканкомы, органы народнай асветы і гандлёвыя арганізацыі аказаць фізкультурным арганізацыям усямерную дапамогу ў развіцці лыжнага спорту.

Семінар для выкладчыкаў фізкультуры

З 25 кастрычніка распачаў сваю работу семінар па перападрыхтоўцы выкладчыкаў фізкультуры поўных сярэдніх і няпоўных сярэдніх школ гор. Брэста. Заняткі праводзяцца два разы ў тыдзень без адрыва ад вытворчасці.

Сустракаюць выбары як усенароднае свята

Дзейсна рыхтуюцца працоўныя Жабінкаўскага раёна да дня выбараў у мясцовыя Советы депутатаў працоўных. Па раёну праведзена 190 сходаў і мітынгаў рабочых, служачых, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў. На гэтых сходах і мітынгах прысутнічала 18 тысяч чалавек.

У раёне закончана вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў у депутаты абласнога і раённага Советаў. Кандыдатамі ў абласны Совет высунут старшыня пораднавога калгаса імені 17 верасня тав. Малошак П. А., старшыня райвыканкома Давыдаў В. С. і загадчык Брэсцкага аблана Коршук К. Ф. 81 чалавек выдвінуты і зарэгістраваны кандыдатамі ў депутаты райсовета. Сярод іх старшыня пораднавога Азяцкага сельсовета тав. Багдановіч Д. М., які ўсё сваё жыццё змагаўся за лепшае будучае працоўных. У 1933 годзе за актыўную революцыйную работу ён быў прыгавораны польскім судом на пажыццёвую катаргу. Толькі з прыходам Чырвонай Арміі ён быў вызвалены з кіпцюроў польскага фашызма. Кандыдатам у райсовет таксама зарэгістраваны Якімук Анастасія Ф... ...оўна,— актывістка па выбарах... ...рхоўных Советы СССР, ... Чна, работніца-стахана... ... промкамбіната, ... вае норму вы...

пропантаў. Таксама кандыдатам у райсовет вылучаны і зарэгістраваны сакратары РК КП(б)Б тав. Кароткін Н. П., Басаў Г. Н., старшыня калгаса імені Варашылава, Макарук М. С. і старшыня калгаса імені Чырвонай Арміі Лаўрынюк Г. Н.

Зараз ва ўсіх населеных пунктах праходзіць высоўванне кандыдатаў у депутаты ў сельскія Советы. На 16 лістапада ўжо высунута 150 чалавек. Усяго па раёну будзе высунута кандыдатамі ў сельскія Советы 267 чалавек. У Азяцкі сельсовет кандыдатамі высунуты звеннявыя калгаса імені Варашылава т.т. Лаўрынюк Ганна Гаўрылаўна і Міранюк Дуня Антопаўна. Сяляне вёскі Баранава вылучылі кандыдатам у Арчыкі сельсовет актывіста-селяніна ... ка Пятра Нікіфаравіча.

Усюды з выключн... актыўнасцю праходзяць сх... і мітынгі выбаршчыкаў. Пра... ...ныя раёна ў сваіх выступле... ...х выказваюць сваю любоў і ... ...ванасць партыі і ўраду. На сх... ...ў ве... ...цы Сакі былы батрак ... ...ко Васіль Якаўлевіч за... ...:

—Нас, батракоў, пр... ...ўлас... польскіх памешчыкаў ... ...ічэ... за людзей, яны здзекав... ...ся ... намі так, як хацелі. Толькі совецкая ўлада дала нам ... ...часл... ...вае і радаснае жыццё, ...ат... ...ўсе правы. Совецкая ... ...ла ... дала мне зямлю, каня, карову — гэта атрымалі ўсе былыя батракі і беднякі. У дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных мы будзем галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Даволі цікава выступленне сялянкі Сірацюк Ефіміі на сходзе выбаршчыкаў вёскі Чыжовічы.

— Пры ўладзе польскай буржуазіі, — гаворыць яна, — у час выбараў солтысаў да нас прыходзіла паліцыя з гміны і прымушала галасаваць за тых кандыдатаў, якіх выстаўляла паліцыя. У дзень выбараў мы хаваліся і не ішлі галасаваць за тых людзей, якіх мы ненавідзелі. Зараз мы самі вылучаем сваіх ... ...ыдатаў, якія будуць абараняць ... нашы інтарэсы, а не інтарэсы ... паноў. Вось чаму ў дзень ... ...раў мы ўсе, як адзін, з'явімся ... выбарчыя ўчасткі і будзем ... ...аваць за народных кандыда...

... сходах сялян выступаюць ... ...онікі маладых калгасаў з ... ...вам аб іх першых поспехах ... ...гтыўнай працы. Старшы... ... ...алгаса імені Варашылава ... Макарук на сходзе ся... ... вёскі Азяты заявіў:

— ...а год калектыўнай працы ... змянілася наша жыццё. ... ...рымалі ад дзяржавы тысячу гектараў зямлі, 20 коней, сто галоў буйнай рагатай жывёлы, 30 свіней і многа сельгасмашын. Сельскагаспадарчы год мы правялі паспяхова, увесь ураджай своечасова ўбралі, выканалі план падняцця зяблівы, поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па пастаўках і грашовых плацяжах. Калгаснікам мы выдалі авансам на працадні па тры кілограмы зернавых і 5 кілограм бульбы. Сям'я былога батрака Канюшка Іосіфа атрымала авансам 2100 кілограм хлеба, 3500 кілограм бульбы, 700 рублёў грашыма. Такіх калгаснікаў у нас многа.

У раёне шырока разгорнута агітацыйная работа. Працуюць 110 гурткоў па вывучэнню Канстытуцыі і выбарчага закона. Комуністамі, комсамольцамі і беспартыйнымі агітатарамі праведзена 870 групавых гутарак аб выбарчай кампаніі, міжнародным і ўнутраным становішчы. Выдатна працуюць агітколектывы Радваніцкага, Чыжовіцкага і іншых сельсоветаў. Цікава праводзяць заняткі настаўніца-комсамолка Радваніцкай НСШ Маслюкова Марыя. Яна рэгулярна, два разы ў тыдзень, збірае сваіх выбаршчыкаў.

На 15 выбарчых участках арганізаваны насценгазеты, у якіх прымае ўдзел 160 оценкораў.

Працоўныя Жабінкаўскага раёна сустракаюць дзень выбараў, як усенароднае свята.

І. Муравіцкі.

244

Падпарадкоўваць дружбу інтарэсам справы

Калі гаворыш аб дружбе, то абавязкова ўспамінаеш дружбу вялікіх правадыроў міжнароднага рэвалюцыйнага руху Маркса і Энгельса, Леніна і Сталіна. Гэтая дружба была моцная таму, што яна грунтавалася на інтарэсах агульнай барацьбы, адзінства ідэалогіі, агульнасці поглядаў. На прыкладзе гэтай дружбы патрэбна вучыць дзетвару. Маркса і Энгельса здружыла барацьба за ідэалы рабочага класа. Энгельс нават аказваў вялікую матэрыяльную дапамогу Марксу, бо яму не хацелася адцягнуць вялікага рэвалюцыянера-мыслісля ад выдатнай працы—„Капітала".

З якім нецярпеннем чакаў таварыш Сталін таго часу, калі ён сустрэнецца з вялікім правадыром рэвалюцыйнага руху Уладзімірам Ільічом Леніным.

Ленін і Сталін былі прывязаны адзін да другога яшчэ тады, калі не бачылі друг друга, бо іх дружба мела цвёрды грунт: класавую барацьбу, барацьбу за ідэалы міжнароднага пролетарыята.

Успомнім дружбу Чапаева і Фурманава. Як цяжка было ім расставацца! І тут дружба паявілася і ўзмацнілася на глебе агульнай барацьбы супроць ворагаў рэвалюцыі.

У нашых школах вельмі мала зроблена, каб растлумачыць дзецям сапраўдны сэнс дружбы. Некаторыя вучні разумеюць дружбу па-свойму. Яны ганарацца той дружбай, калі ім удаецца абараніць свайго таварыша, „вывесці" яго з непрыемнага становішча, калі ўдасца „змазаць" сляды таго або іншага злачынства.

Такая дружба ілжыва, яна не мае пад сабой ніякай глебы. Раз вучань парушыў устаноўленыя традыцыі школы, абразіў настаўніка, свайго таварыша, — такі вучань заслугоўвае рэзкага асуджэння.

Вучань 9 класа 15 СШ Е. [illegible] і грубымі паводзінамі прымушае настаўніцкі калектыў звярнуць на яго належную ўвагу.

Урок. Настаўнік дае Е. заўвагу. І раптам з уласцівай яму грубасцю Е. устае і заяўляе „я вас слухаць не хачу, я вам не падпарадкоўваюся". У буфеце вучні атрымоўваюць снеданне па чарзе, а вучань Е. адштурхоўвае малышоў і падыходзіць без чаргі да буфета.

— Не штурхайце дзяцей, займіце чаргу, — заўважае дзяжурная настаўніца. Зараз-жа Е. груба адказвае настаўніцы.

Паступак несумяшчальны з паводзінамі вучня савецкай школы і ён заслугоўвае рэзкага асуджэння ўсяго калектыва школы.

Клас сустрэў гэта, як нармальную з'яву. Вучня Е. выключылі са школы. Да выключэння яму далі магчымасць прадумаць свой учынак.

Яго вызвалі на комсамольскі камітэт, з ім гутарыў дырэктар школы.

— Ці адчулі вы ганебнасць свайго ўчынку.

— А што я такое зрабіў, — груба адказаў вучань на запытанне дырэктара. І ні каплі перажывання.

У класе даведаліся аб выключэнні Е. са школы. І тут з'явіліся „хадакі" аб аднаўленні Е. у правах вучня. Увесь клас замітусіўся, забегаў, ажыў, загаварыў. Агульны сход. Мета сходу—стварыць грамадскую думку вакол паступка Е. Навучыць іншых на гэтым прыкладзе. Выступае вучань Капылоў і бяре яго пад абарону.

І гэта выступленне вучня 9 класа. Ён лічыць, што гэтым выканаў доўг дружбы перад сваім таварышом, дапамог яму „выратавацца" замест таго, каб прымусіць таварыша ўсведаміць яго ганебны ўчынак, паглыбіў яго памылку, падтрымаў яго грубасць.

Былі выступленні, асуджаўшыя паступак Е., але асцярожныя, робкія. Яны таксама рабіліся з той мэтай, каб „выратаваць" таварыша. Вучаніцы Бабенка і Чыжэнка нават загаварылі аб жаданні перавыхаваць свайго таварыша, аб калектыўным уздзеянні на яго, але і гэта рабілася нашчыра з-за ілжывай дружбы.

Мы не супроць спайкі класа. Мы адабраем барацьбу вучня за свайго таварыша, але гэтая абарона павінна праводзіцца ў імя падняцця чэсці класа, школы, знішчэння парокаў вучняў.

Толькі старая школа старалася ўнесці ў вучнёўскі калектыў разлад, а таму яна выхоўвала традыцыю дзялення вучняў на катэгорыі. Былі „любімчыкі" і „ненавісныя", былі „зубрылы-мучанікі", „мораплаваценці", „цісхоні" і „падхалімы", былі „сільныя" і „слабенькія" багатыя і бедныя. Велізарны разлад, адсутнасць дружбы і кантакту паміж вучнямі і настаўнікамі былі звычайнай нормай старой школы, якая ставіла сваёй асноўнай мэтай выхоўваць пакорлівых прыслужнікаў капіталістычнага грамадства.

Савецкая школа выхоўвае людзей дружных, працавітых, сапраўдных барацьбітоў за інтарэсы працоўных. Дрэнны той друг, які парушае каштоўныя ўстої савецкай школы.

У сваіх успамінах аб дружбе таварыш Крупская пісала: „Калі я вырасла і стала комуністкай, я зразумела, якое значэнне мае дружба, як яна дапамагае ў рабоце, як важна таварыская дапамога, клопаты блізкага таварыша, але ў той-жа час, калі нават самы блізкі таварыш абараняе няправільны пункт гледжання, калі яго паступкі шкодзяць справе, трэба з ім змагацца, трэба з ім рваць блізкія адносіны".

Надзежда Канстанцінаўна раіць такім чынам у першую чаргу падпарадкаваць дружбу інтарэсам справы.

Мы ўжо ў нашых школах маем выдатныя прыклады дружбы ў класе, якая падпарадкавана інтарэсам вучобы і дысцыпліны, прывіцця працоўных навыкаў.

6 клас 8 НОШ. Настаўніца праводзіць кантрольны дыктант. Вучні Трэйсман і Эльман раздабылі дзесьці тэкст кантрольнага дыктанта. Яны нават паспелі спісаць яго, (дарэчы, спісалі дрэнна). Аб гэтым даведаліся вучні. Колькі абурэння!

Агульны сход класа. Вучні па чарзе выступаюць з патрабаваннем прызнання іх таварышамі ганебнасці гэтага паступка.

— Патрэбна вучыцца самастойна, чэсна, — гаворыць адзін вучань. Мы павінны асудзіць учынак нашых таварышоў.

Сваю віну вучні Трэйсман і Эльман прызналі. І клас пакаянейшаму застаўся дружным. У 6 класе праводзіцца барацьба са спазненнямі, няўважлівымі пропускамі заняткаў. Кожны вучань лічыць для сябе гонарам змагацца за чэсць класа, за чэсць школы. Вучань Юшчук ходзіць на заняткі за 9 кілометраў і за ўвесь час адзін раз спазніўся і то ён заплакаў і прасіў прабачэння, бо ён парушыў традыцыю класа. Вучні вядуць рэзкую барацьбу з падказамі ў той час яны дружны і спаяны.

Пры такой дружбе і спайцы клас несумненна даб'ецца высокай паспяховасці.

Ужо ў першай чэрці навучальнага года 6 „В" клас 5 СШ, дзякуючы ўзаемадапамозе таварышоў і дружбе, дабіўся 96,4 процанта абсалютнай паспяховасці.

Вучаніца К. гэтага класа мае дрэнна па алгебры. Яе падруга, вучаніца Маліноўская, абавязалася ёй дапамагчы. У класе ўстанавілася традыцыя дапамагаць адстаючым. Тут 80 процантаў выдатных і добрых адзнак. Вучні таксама непрымірымы да антыдысцыплінаваных паступкаў сваіх таварышоў. Класны кіраўнік тав. Гейхрых намала папрацаваў, каб атрымаць належныя вынікі.

Вялікую справу зрабілі-б таксама вучні 9 класа 15 СШ, тады, калі-б яны выратавалі свайго таварыша, давёўшы да яго свядомасці ганебнасць учынка, а затым дапамаглі-б яму вызваліцца ад сваіх парокаў, ганьбачых савецкую школу.

Вучню Е. далі магчымасць вучыцца ў школе, але гэты факт вымушае прыдумацца многія настаўніцкія і вучнёўскія калектывы над выхаваннем сапраўднай дружбы.

Шмат патрэбна папрацаваць, каб выхоўваць рэбят у духу непрымірымасці да недысцыплінаваным паступкам. Настаўніцкім калектывам, комсамольскім і піонерскім арганізацыям трэба дабіцца такой дружбы, якая-б служыла ўмацаванню дысцыпліны, павышэнню паспяховасці, падняццю чэсці савецкай школы.

Н. А. Рабоўскі.

Экспедыцыі па вывучэнню беларускай гаворкі

На працягу чэрвеня і лістапада 1940 года ў заходніх абласцях БССР працавалі тры экспедыцыі па вывучэнню беларускай гаворкі. Удзельнікі экспедыцыі навуковы супрацоўнік Інстытута мовы і літаратуры Акадэміі навук БССР пабылі ў 10 раёнах Баранавіцкай, Беластоцкай і Вілейскай абласцей.

Экспедыцыі сабралі многа каштоўных для гісторыі беларускай мовы, граматыкі сучаснай мовы і дыялекталогіі матэрыялаў.

Прадвыбарчы сход моладзі

У выхадны дзень, 17 лістапада, у памяшканні клуба адбыўся прадвыбарчы сход моладзі прадмесця Валынкі, на які з'явілася больш 150 чалавек.

З дакладам аб выбарчай сістэме ў капіталістычных краінах і СССР і аб задачах моладзі ў разгарнуўшайся кампаніі па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных выступіў т. Паўлаў.

Пасля дакладу слова ўзяў малады выбаршчык комсамолец т. Шарапаў.

— У мінулым, пры ўладзе польскіх памешчыкаў і капіталістаў працоўная моладзь пазбаўлена была права ўдзельнічаць у выбарах дзяржаўных органаў улады. Поўная магчымасць для ўдзелу ў палітычным і грамадскім жыцці краіны прадстаўлена моладзі пры ўладзе Саветаў.

15 снежня я з вялікай радасцю прыду на выбарчы ўчастак і аддам свой голас за лепшых людзей працоўнага народа, за сталінскі блок комуністаў і беспартыйных.

Выступіўшы на сходзе старшыня ўчастковай выбарчай камісіі тав. Сімановіч прызваў моладзь Валынкі актыўна ўключыцца ў выбарчую кампанію, дапамагчы ў рабоце ўчастковай камісіі.

У аднадушна прынятым рашэнні моладзь абавязалася шырока разгарнуць агітацыйна-масавую работу сярод насельніцтва па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона. 15 снежня, у дзень выбараў у мясцовыя органы ўлады разам з усімі выбаршчыкамі свайго ўчастка прыйсці да выбарчых урнаў і аддаць свае галасы за лепшых сыноў і дачок нашай радзімы.

А. Кацубо.

Выстаўка выяўленчага мастацтва

У памяшканні гортэатра 6 лістапада адкрылася другая абласная выстаўка выяўленчага мастацтва самадзейных мастакоў, прысвечаная XXIII гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

На выстаўцы прадстаўлены 40 работ 13 самадзейных мастакоў. Сярод іх патрэбна адзначыць работы здольнага самадзейнага мастака тав. Рудчыка І. Д, які з'яўляецца ўдзельнікам выстаўкі „Ленін і Сталін—арганізатары БССР".

...На пярэднім плане маці з дзіцём насучыя галлё. Яны застанавіліся і з радасцю і шчасцем сустракаюць родную Чырвоную Армію, сваю вызваліцельніцу.

З палёў кінуўшы работу, працоўныя Заходняй Беларусі сустракаюць доўгачаканага гасця — Рабоча - Сялянскую Чырвоную Армію, — вось кароткі змест карціны Рудчыка „Сустрэча Чырвонай Арміі".

У другой карціне „Мясцовае насельніцтва дапамагае чырвоным разведчыкам" мастак перадае, як працоўныя дапамагаюць Чырвонай Арміі ў знішчэнні нянавісных памешчыкаў і капіталістаў.

Заслугоўвае ўвагі работа самадзейчага мастака—урача Белавежскай амбулаторыі А. В Власава, які таксама з'яўляецца ўдзельнікам выстаўкі „Ленін і Сталін арганізатары БССР". Яго пейзажы ў Белавежскай пушчы „Восень", „Пушча", „Кармушка для зубраў" сакавітыя, радуюць вока сваёй прыгожасцю прыроды.

Нельга не адзначыць ізабражэнне І. В. Сталіна, зробленае з некалькіх парод дрэва работы настаўніцы Вейс і хатняй гаспадыні Слонінскай (Сямяцічы).

З экспанатаў гэтай выстаўкі 8 карцін экспаніруюцца па ўсебеларускую выстаўку „Ленін і Сталін—арганізатары БССР". Мы пасылаем карціны Рудчыка, Власава і маладога здольнага Шыкіна, які зараз вучыцца ў мастацкім вучылішчы.

У сакавіку 1941 года ў Маскве адкрываецца ўсесаюзная выстаўка самадзейных мастакоў „Ф'арона СССР". Самадзейныя мастакі нашай вобласці павінны прыйсці да гэтай выстаўкі з карцінамі, паказваючымі шчаслівыя і радасныя будні нашай соцыялістычнай радзімы, яе абаронную магутнасць.

А. Беляўскі,
метадыст па ІЗО, Брэсцкага Дома народнай творчасці.

ЗМЯНІЦЬ ГАДЗІНЫ РАБОТЫ МАГАЗІНАЎ

Магазіны і ларкі Бярозаўскага гарпо (за выключэннем хлебных) працуюць з 9 да 17 гадзін 30 мінут. У гэты-ж час усе рабочыя і служачыя зачаты работай на прадпрыемствах і ва ўстановах. Такім чынам яны не маюць магчымасці купіць неабходны ім тавар.

Таксама ў горадзе ёсць 2 магазіны культтавараў і ў абедвух выхадны дзень у панядзелак. Няўжо нельга было зрабіць, каб выхадны быў у гэтых магазінах не ў адзін і той-жа дзень? Безумоўна можна.

Пытанне аб змене гадзін работы магазінаў неаднаразова падымалася працоўнымі перад Бярозаўскім райспажыўсаюзам. Аднак тут не лічацца з законнымі патрабаваннямі спажыўцоў.

Авербух.

Курсы шофераў і матацыклістаў

Пры абласным аўтамотаклубе з 20 кастрычніка работаюць курсы па падрыхтоўцы шофераў. На курсах займаецца 37 чалавек працоўнай моладзі прадпрыемстваў і ўстаноў гор. Брэста. Курсы разлічаны на 5 месяцаў, праходзяць яны без адрыва ад вытворчасці.

Абласны аўтамотаклуб у падарунак усенароднаму святу — дню Канстытуцыі рыхтуе групу матацыклістаў. На курсах займаюцца 18 чалавек рабочай моладзі прадпрыемстваў гор. Брэста Усе яны з'яўляюцца актыўнымі фізкультурнікамі, состаяць у таварыстве „Будаўнік цэнтра".

Дрэнна выконваюцца судовыя рашэнні

Народны Камісарыят Юстыцыі СССР устанавіў, што рашэнні народных судоў у Беларусі выконваюцца яўна нездавальняюча. На пасяджэнні калегіі Наркамюста было ўстаноўлена, што толькі 36 процантаў рашэнняў народнага суду выканана ў тэрмін.

Асабліва марудна ажыццяўляюцца судовыя рашэнні па аліментных справах. Дрэнна спагнаюцца таксама страты ад растрат і раскрадванняў. У судовага выканаўцы Шаломід (з участак гор. Барысава, Мінскай вобласці) выяўлена 99 невыкананых рашэнняў.

Калегія Наркамюста СССР прапанавала Наркому Юстыцыі БССР т. Падуто тэрмінова праверыць усю работу судовых выканаўцаў. Да 1 студзеня павінен быць укамплектаван штат судовых выканаўцаў рэспублікі.

За добрую работу прэміраваны судовыя выканаўцы пры народных судах 1 ўчастка Лідскага раёна, Баранавіцкай вобласці, тав. Шанаўскі і 4 участка г. Мінска—т. Патапчук.

Выканаўца Шаломід з работы знят і аддан суду.

(ТАСС).

Урачыстае пасяджэнне прысвечанае памяці Л. Н. Талстога

У вялікім зале мінскага Дома партыйнай асветы адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 30-годдзю з дня смерці Льва Мікалаевіча Талстога, скліканае гаркомам КП(б)В, прэзідыумам Акадэміі навук БССР і праўленнем Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР.

Ушанаваць памяць [illegible] рускага пісьменніка, г[illegible] мастака слова прышлі[illegible]цы мінскіх прадпрыем[illegible] жынеры, тэхнікі, дзеяч[illegible] партыйныя і комсамол[illegible] ботнікі, пісьменнікі, [illegible] студенты.

У прэзідыуме — народны паэт БССР акадэмік Якуб Колас, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Мінскага ГК КП(б)Б т. Фішбейн, пісьменнікі М[illegible] Лынькоў, Змітрок Вядуля, Кандрат Крапіва, камп[illegible] Туранн[illegible], народны артыст БССР Вла[illegible] і іншыя.

[illegible]чыстае пасяджэнне адкрыў [illegible] паэт БССР акадэмік [illegible] Колас.

З дакладам на тэму „Талстой [illegible]" выступіў акадэмік [illegible] Вальфсон.

(„Звязда").

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 17 лістапада. (ТАСС). У зводцы вярхоўнага камандвання германскай арміі паведамляецца: „Па дадатковых вестках, у часе налёту на Лондан у ноч на 16 лістапада быў пашкоджан Ватэрлоо-Брыдж. Бомбы былі скінуты на вакзал Педзінгтона, на газавы завод у Кенінгстоне і на газавы завод паблізу гандлёвых докаў. На апошнім узнікілі буйныя пажары. У розных пунктах Паўднёвай Англіі, у прыватнасці ў Портсмуце і Саутгемтоне, пашкоджаны важныя ваенныя аб'екты.

16 лістапада былі зноў бамбардыраваны Лондан і розныя раёны паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Англіі. На працягу дня германскія бамбардыроўшчыкі атакавалі рад англійскіх суднаў. Пры гэтым былі патоплены: гандлёвае судно вадазмяшчэннем у 8 тысяч тон, танкер у 3 тысячы тон і гандлёвы параход у 2 тысячы тон. 2 другіх гандлёвых параходы цяжка пашкоджаны.

Раніцой 16 лістапада дальнабойная артылерыя паспяхова абстраляла англійскі караван суднаў.

У часе налёту на Германію у ноч на 17 лістапада англійскі самалёты бамбардыравалі галоўным чынам Гамбург, Бремен і Кіль. Важным ваенным аб'ектам былі нанесены нязначныя страты. Далейшыя налёты былі накіраваны супроць населеных пунктаў і жылых кварталаў. Большая частка бомб упала ў Эльбу і ў адкрытым полі. Налічваецца 14 забітых і некалькі раненых. У ноч на 17 лістапада над паўночным узбярэжжам Францыі збіт непрыяцельскі самалёт. У ноч на 17 лістапада над Гамбургам збіт другі самалёт праціўніка. Трэці самалёт збіт пачымі знішчальнікамі. Адзін германскі самалёт не вярнуўся на сваю базу.

Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што германскія разведчыкі, лятаўшыя ўчора над Англіяй, устанавілі, што бамбардыроўка германскімі самалётамі Лондана выклікала вялікія пажары ў Сіці. На берагах Тэмзы адзначаны попаданні бомб у склады харчавання.

Высяленне французаў з Латарынгіі

Германскія ўлады прынялі рашэнне аб высяленні з Латарынгіі ўсіх жыхароў, якія гавораць на французскай мове. Выселеным прапанавалі выбраць у якасці новага месца жыхарства Польшчу або Францыю. Французы выбралі Францыю.

З 11 лістапада пачалося высяленне. Да 16 лістапада на тэрыторыю неакупіраванай зоны Францыі прыбыла з Латарынгіі 28 тысяч чалавек.

Як перадае агенцтва Гавас, французам было заяўлена, што перасяленне было прадугледжана пагадненнем, заключаным паміж французскімі і германскімі ўрадамі. Французкі ўрад, указвае агенцтва, абвяргае гэта. У часе франка-германскіх перагавораў, заяўляе агенцтва, пытанне аб падобнага роду мерах разу не абмяркоўвалася.

14 лістапада французкі ўрад заявіў германскім уладам пратэст супроць няўзгодненага высялення французаў з Латарынгіі.

(ТАСС)

Гібель англійскага парахода „Эмпрэс оф Джапан"

Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што англійскі параход „Эмпрэс оф Джапан", які ішоў пад канадскім сцягам, стаў афярай пажара, узнікшага, як маркуюць, у рэзультаце налёту германскага самалёта. „Эмпрэс оф Джапан" — вялікі пасажырскі параход таннажам у 26 тысяч тон, быў пасля пачатку вайны пераабсталяван у дапаможны крэйсер і прадназначан для перавозкі войск у Англію. Швейцарская газета „Сюіз" указвае, што на барту парахода знаходзілася 7000 канадскіх салдатаў.

(ТАСС)

Вайна паміж Італіяй і Грэцыяй

У зводках вярхоўнага камандвання грэчаскай арміі ўказваецца, што 15 і 16 лістапада на ўсім фронце і асабліва ў горным раёне, на ўсход ад Корыцы адбываліся сур'ёзныя бае. Грэчаскімі войскамі захвачана вялікая колькасць ваеннапалонных, зброя і ўсякага рода ваенныя матэрыялы.

Карэспандэнт амерыканскага агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што італьянцы адступаюць з Корыцы. Горад поўнасцю акружан грэчаскімі войскамі.

Агенцтва Рэйтэр перадае, што грэчаскія войскі зноў занялі [illegible] грэчаскія сяленні, захвачаныя італьянцамі. Апошнім пунктам адкуль адступілі італьянцы, быў Коніца. Грэчаскія войскі прадаўжаюць энергічна прасоўвацца ў [illegible]рад на албанскай тэрыторыі.

Балгарская газета „Зора" піша, што італьянцы кінулі супраць грэкаў навейшыя тыпы самалётаў у прыватнасці магутныя трохмоторныя бамбардыроўшчыкі. Больш паспяховай была бамбардыроўка грэчаскіх пазіцый у [illegible] не востраве Прэспа.

(ТАСС)

Турэцкая газета аб эканамічным становішчы Турцыі

Турэцкая газета „Хакікат" змяшчае артыкул, у якім прызнае цяжкае эканамічнае становішча краіны. Уздараванне жыцця расце. Турэцкі ўрад вымушан выпускаць у зварот папяровыя грошы. У сувязі з мабілізацыяй адчуваецца недахоп у рабочай сіле на прадпрыемствах, якія выпрацоўваюць прадметы першай абходнасці.

Артыкул заклікае турэцкі ўрад і дзяржаўныя арганізацыі абмежаванне спажывання і выдкавання сродкаў толькі на ваенныя мерапрыемствы.

(ТАСС)

40.000 беспрацоўных у Нарвегіі

Нарвежскі друк паведамляе, што ў Нарвегіі налічваецца каля 40 тысяч беспрацоўных. У сувязі з скончэннем зімовага сезонных работ лік беспрацоўных узрасце яшчэ больш.

Нарвежскія газеты пішуць, што паміж Германіяй і Нарвегіяй заключан дагавор аб пасылцы нарвежскіх рабочых, галоўным чынам беспрацоўных, у Германію. Перадаюць, што павінна быць адпраўлена да 20 тысяч кваліфікаваных рабочых.

(ТАСС)

Адказны рэдактар Г. Т. МІНЧУК

Да ведома ветурачоў і калгасаў

з 10 лістапада г. г. адкрылася ў Брэсце па вул. Савецкая 118

ВЕТЭРЫНАРНАЯ АПТЭКА,

у якой пастаянна знаходзяцца ветмедыкаменты і інструменты, неабходныя для ветэрынарнай практыкі напрыклад, як крэаліц, лізол, сыва раткі, шарыцы і пр.

Брэсцкай аблпілемзаготкантары

ПАТРАБУЮЦЦА:

бухгалтар-касір і вопытныя загатавіцелі мыйлы ў раёнах.

Звяртацца па адрасу: Брэст, Савецкая 12

Пілемзаготкантара.

Гарадскому здраўадзелу

[illegible] бухгалтар

Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян гор. Брэста і вакол[illegible], што

ЎСЕ МАГАЗІНЫ

горхартыромгандля і сельпо раёнаспажыўсаюзаў

АБАВЯЗАНЫ

купляць парожныя бутэлькі з-пад водкі манапольнага ўзору

ПА НАСТУПНЫХ ЦЭНАХ:

1 літровая — 80 кап.
0,5 і 0,25 л. — 50 кап.
0,1 л. — 30 кап.

У выпадку адмовы ў прыёме бутэлек патрабуйце ў загадчыка магазіна кнігу скарг для ўнясення скаргі і звяніце па тэлефону № 216 Водачны завод.

Дырэкцыя.

СЕНЯ Ў КІНОТЭАТРАХ

Кінатэатр „1-ге МАЯ"

МУЗЫКАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Кінатэатр імені ГОРКАГА

АГНІ ВЯЛІКАГА ГОРАДА

Адрас рэдакцыі г. Брэст, вуліца імені Карла Маркса 29. Тэлефоны: адказнага [illegible] — [illegible] м. адказнага рэдактара — [illegible] і аддзелы: эканамічны, партыйны і прапаганды [illegible] 1-23 [illegible] рэдакцыі — 6-15.

УД — 575